УДК 94(476.5+476.4):34

# СУДОВЫЯ ЎСТАНОВЫ ПОЛАЦКАЙ І МАГІЛЁЎСКАЙ ГУБЕРНЯЎ У 1778–1797 гг.

# JUDICIAL INSTITUTIONS OF MOGILEV AND POLOTSK PROVINCES IN 1778–1797

*И. Г. Гущинск*

*кандидат исторических наук, доце*

*Белорусский государственный педагогический университет имени Максима Та*

*Минск, Республика Белар*

*I. Hushchy*

*PhD in History, Associate Profes*

*Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank, Mi*

*Republic of Bela*

У 1772 г. у выніку 1-га падзелу Рэчы Паспалітай усходнебеларускія землі былі ўключаны ў склад Расіі. У сферы правасуддзя расійскімі ўладамі тут быў праведзены шэраг мерапрыемстваў, накіраваных на ўніфікацыю мясцовай судовай сістэмы з расійскай. Галоўным з іх стала ўвядзенне тут у 1778 г. "Учреждений для управления губерний Всероссийской империи". Пры гэтым у сферы грамадзянскага судаводства захоўвалася дзеянне Статута ВКЛ 1588 г. і выкарыстанне польскай мовы.

In 1772, as a result of the 1st division of Poland the Eastern Belarusian lands were incorporated into Russia. In the field of justice by the Russian authorities carried out a number of activities aimed at the unification of Russian and the local judicial systems. The main activity was introducing the "The institutions of provincial administration of the Russian Empire" in 1778. The Statute GDL of 1588 and the use of the Polish language remained acting in the field of civil court proceedings.

• • • • • •

*Ключавыя словы:* падзелы Рэчы Паспалітай; судовая сістэма; судаводства; судаўладкаванне; Статут ВКЛ 1588 г.; Магілёўская губерня; Пскоўская губерня; Полацкая губерня; беларускія губерні.

*Keywords:* division of the Polish-Lithuanian Commonwealth; judicial system; legal proceedings; the Statute of The Grand Duchy of Lithuania of 1588; Mogilev province; Pskov province; Polotsk province; Belarusian provinces.

У 1772 г. адбыўся першы падзел Рэчы Паспалітай, у выніку якога ўсходнебеларускія землі былі далучаны да Расійскай імперыі, што азначала пачатак прынцыпова новага этапу ў гісторыі беларускага народа. Тут былі створаны 2 губерні – Магілёўская і Пскоўская, у склад якой уваходзілі як беларускія, так і рускія правінцы. А ў 1776 г. з беларускіх правінцый Пскоўскай губерні была сфарміравана асобная Полацкая губерня. Дадзеныя губерні ў афіцыйных дакументах таксама згадваюцца пад агульным тэрмінам "беларускія губерні". Ад самага пачатку палітыка расійскіх улад на далучанай тэрыторыі была накіравана на яе інтэграцыю ў склад імперыі. Адным з праяўленняў гэтага стала ўкараненне і ўмацаванне тут сістэмы мясцовых органаў дзяржаўнай улады як апоры і праваднікa палітыкі цэнтральнага ўрада, што не было характэрна для часоў Рэчы Паспалітай. У гэтым рэчышчы ўжо з 1772 г. расійскімі ўладамі праводзіліся пераўтварэнні ў сферы правасуддзя, якія значна набліжалі мясцовую судовую сістэму да ўзору ўнутраных губерняў імперыі. Важнейшае значэнне ў гэтым сэнсе мела ўвядзенне у Полацкай і Магілёўскай губернях у 1778 г. "Учреждений для управления губерний Всероссийской империи" 1775 г. (далей – "Учреждения…"), што азначала ўніфіка сістэмы судаўладкавання. Дадзеныя судовыя ўстан расійскага ўзору дзейнічалі ў беларускіх губерня 1797 г., калі Паўлам І былі вернуты суды ўзору час ВКЛ і Рэчы Паспалітай.

Праблема ўвядзення ў Полацкай і Магілёўск губернях судовых органаў паводле "Учреждений… а таксама іх дзейнасць, закраналася ў працах У. Л. Ле танена [1, с. 278–295], У. А. Грыгор'ева [2, с. 32 П. М. Жуковіча [3], Я. К. Анішчанкі [4, с. 116, 18 С. Л. Лугаўцовай [5], С. Годзэка [6], Н. М. Яфрэм вай [7], А. П. Жытко, С. А. Талмачовай і І. Г. Гушчы скага [8], і некаторых інш. Пры гэтым у гістарыягра адсутнічаюць працы, спецыяльна прысвечаныя су вым установам Полацкай і Магілёўскай губерняў ме віта ў перыяд укаранення і дзеяння тут у канцы XVIII с "Учреждений…" Кацярыны II 1775 г. Многія аспек дадзенай праблемы застаюцца слаба асветленымі аль ўвогуле нявывучанымі. Шэраг трактовак і сцвердж падаецца рознымі аўтарамі супярэчліва. Разам з ты дэтальнае раскрыццё гэтай тэмы дае магчымасць боль

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

глыбокага і ўсебаковага вывучэння гісторыі Беларусі ў перыяд падзелаў Рэчы Паспалітай.

Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай расійскімі ўладамі на далучанай тэрыторыі было захавана дзеянне ў сферы правасуддзя мясцовых норм і правілаў (г. зн. III Статута ВКЛ, пастаноў Сейма Рэчы Паспалітай, судовай практыкі), а таксама польскай мовы [9]. Першапачаткова працягвалі дзейнічаць і самі папярэднія судовыя ўстановы – гродскія, земскія, падкаморскія суды, а таксама магістраты і ратушы. Аднак неўзабаве быў прыняты шэраг захадаў па набліжэнні мясцовай сістэмы правасуддзя да агульнарасійскага ўзору. Ужо ў канцы 1772 г. тут былі створаны губернскія і правінцыйныя канцылярыі [10], [11] – судова-адміністрацыйныя органы, у кампетэнцыю якіх перадаваліся крымінальныя справы. А ў 1773 г. былі ўведзены губернскія і правінцыйныя земскія суды, да якіх пераходзілі функцыі грамадзянскага правасуддзя [12]. Адпаведна, там дзе яны непасрэдна пачыналі дзейнічаць – імі паглыналася юрысдыкцыя былых мясцовых гродскіх, земскіх і падкаморскіх судоў.

Трэба адзначыць, склад губернскіх і правінцыйных земскіх судоў выбіраўся мясцовым дваранствам. Аднак важнай акалічнасцю тут стала ўвядзенне маёмаснага цэнзу для ўдзелу ў выбарах, чаго да гэтага не было. Права выбіраць суддзяў давала наяўнасць які мінімум 10 душ мужчынскага полу, а быць выбраным на гэтыя пасады – 20 душ. Натуральна, значны пласт дробнай шляхты пазбаўляўся права ўдзелу ў выбарах. Яшчэ адным важным новаўвядзеннем стаў пераход аплаты працы судовых чыноўнікаў на сродкі казны. У той час як раней гэта рабілася за кошт пошлін з зацікаўленых бакоў [12].

Тым часам расійскім урадам вялася падрыхтоўка рэформы сістэмы мясцовага кіравання ў імперыі. 7 лістапада 1775 г. Кацярынай II былі падпісаны ўжо згаданыя вышэй "Учреждения..." [13]. Дадзены дакумент прадугледжваў карэнную рэформу адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу, а таксама сістэмы органаў мясцовага кіравання і суда ў краіне. Аднак непасрэднае адкрыццё новых устаноў патрабавала шэрагу падрыхтоўчых мерапрыемстваў. Трэба было правесці адміністрацыйна-тэрыятарыяльны падзел, а таксама вызначыць крыніцы фінансавання, падабраць ці нават пабудаваць памяшканні для ўстаноў і г. д. Увядзенне "Учреждений..." у беларускіх губернях адбылося раней, чым у большасці іншых [3, с. 102]. Адпаведны ўказ быў падпісаны Кацярынай II 10 студзеня 1778 г. [14]. У Полацкай губерні новыя ўстановы былі ўрачыста адкрыты ў маі, а ў Магілёўскай – у чэрвені 1778 г. [15], [16].

Судовая сістэма паводле "Учреждений..." насіла яскрава выяўлены саслоўны характар. Асобныя судовыя ўстановы прадугледжваліся для дваран, гарадскіх саслоўяў і непрыватнаўласніцкіх сялян. Структурна судовая сістэма складалася з 3-х інстанцый на ўзроўні паветаў і губерняў (ніжняй, сярэдняй і верхняй), а таксама вышэйшай судовай інстанцыі – Сената.

Для дваран судом 1-й (ніжняй) інстанцыі з'яўляліся павятовыя суды, якія знаходзіліся ў павятовых гарадах. Пры павятовых судах знаходзіліся дваранскія апекі. Яны займаліся пытаннямі апякунства над сіротамі, удовамі, састарэлымі, недзеяздольнымі, марнатраўцамі з ліку дваран, кіравання вымарачнымі маёнткамі і інш. 2-й (сярэдняй) судовай інстанцый для дваран з'яўляліся верхнія земскія суды, якія размяшчаліся ў губернскіх гарадах. Для гарадскіх саслоўяў (купецтва і мяшчанства) судом 1-й інстанцыі былі гарадавыя магістраты. Пры іх дзейнічалі сірочыя суды, якія фактычна былі аналагам дваранскіх апек. Трэба адзначыць, што на момант увядзення на тэрыторыі Беларусі "Учреждений..." магістраты існавалі не ва ўсіх гарадах. Цяпер іх колькасць узрастала больш чым у два разы [3, с. 108]. Апеляцыйнай інстанцыяй для гарадавых магістратаў і сірочых судоў былі губернскія магістраты. Існавалі адмысловыя саслоўныя суды і для непрыватнаўласніцкіх сялян (аднадворцаў, дзяржаўных, манастырскіх і некаторых інш.). Судом 1-й інстанцыі для іх былі ніжнія расправы, апеляцыйнай – верхнія расправы. Склад усіх згаданых саслоўных судоў 1-й і 2-й інстанцыі фарміраваўся пераважна па выбарным прынцыпе – ад адпаведных саслоўяў. Па прызначэнні замяшчаліся пасады толькі старшынь ніжніх і верхніх расправаў (адпаведна, губернскім праўленнем і Сенатам), а таксама старшынь губернскіх магістратаў (Сенатам).

У губернскіх гарадах знаходзіліся суды 3-й (верхняй) інстанцыі – палаты грамадзянскага і крымінальнага суда. Яны разглядалі справы ўсіх саслоўяў. Кожная з палат складалася са старшыні, 2-х саветнікаў і 2-х асэсараў. Старшыні прызначаліся імператарскай уладай па прадстаўленні Сената, а саветнікі і асэсары – Сенатам. Г. зн. гэтыя суды былі цалкам кароннымі, без элементу выбарнасці.

Асобна ад апісанай 3-ступенчатай судовай сістэмы мясцовых судоў паводле "Учреждений..." уводзіліся так званыя "совестные" суды, якія знаходзіліся ў губернскіх гарадах. Ім былі падсудны справы, у якіх меліся змякчальныя для абвінавачанага абставіны, а таксама грамадзянскія цяжбы, калі за вырашэннем спрэчкі звярталіся адразу абодва бакі. У склад "совестного" уваходзілі суддзя (у якасці старшыні), якога прызначаў генерал-губернатар, і 6 засядацеляў (выбарных па 2 ад кожнага саслоўя) [13].

Важным элементам судова-адміністрацыйнай рэформы Кацярыны II з'яўлялася ўпарадкаванне сістэмы ўрадавага кантролю над судовай сістэмай. Гэты кантроль павінны быў ажыццяўляцца праз пракурораў і страпчых [13]. Адзначым, што ў беларускіх губернях пасады пракурораў былі ўведзеныя яшчэ адразу пасля

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

далучэння гэтай тэрыторыі да Расіі – паводле ўказа Кацярыны II ад 13 снежня 1772 г. [17].

Такім чынам, у 1778 г. у беларускіх губернях была ўведзена расійская сістэма судовых органаў паводле "Учреждений…". Аднак гэта не азначала спынення дзеяння III Статута ВКЛ і сеймавых канстытуцый Рэчы Паспалітай, якія, разам з польскай мовай справаводства, працягвалі дзейнічаць у сферы грамадзянскага судаводства.

Генерал-губернатар З. Чарнышоў пры ўвядзенні ў беларускіх губернях "Учреждений…" даваў судам інструкцыі аб тым, якія справы трэба было разглядаць па расійскіх законах. Аднак, нягледзячы на гэта, узнікалі блытаніна і спрэчныя сітуацыі адносна таго, якія прававыя нормы (мясцовыя ці расійскія) выкарыстоўваць пры разборы той ці іншай справы [18, арк. 263]. За вырашэннем такога роду пытанняў суды паводле арт. 405 "Учреждений..." павінны былі звяртацца да губернскіх пракурораў. У некаторых выпадках яны перадаваліся на абмеркаванне Сената.

Напрыклад, такая сітуацыя склалася вакол спраў аб выкананні грашовых абавязкаў па вэксалях, аб якіх мясцовае "статутавае" права не згадвала. У 1782 г. у Полацкі губернскі магістрат паступіла апеляцыя па вэксальнай справе паміж падлекарам Кавецкім і рэгістратарам Адамовічам, вырашанай да гэтага Полацкім гарадскім магістратам. Аднак губернскі магістрат на падставе таго, што ў 1-й інстанцыі справа разбіралася паводле расійскага "Вексельного устава" 1729 г., і спасылаючыся на ўказ ад 8 мая 1773 г. аб разборы грамадзянскіх цяжбаў па мясцовым законам, прымаць да разгляду дадзеную апеляцыю адразу адмовіўся. Дадзены казус спачатку быў перададзены на вырашэнне выконваючаму абавязкі пракурора губернскага магістрата стрАпчаму Някрасаву. Той, у сваю чаргу, звярнуўся да губернскага пракурора Мендзялеева. У рэшце дадзенае пытанне разглядалася Сенатам. Той пастанавіў, каб увогуле справы аб даўгавых абавязках разглядаліся паводле мясцовага права, але ў выпадку, калі бакі па ўзаемнай згодзе афармяць вэксальны абавязак па ўстаноўленаму "Вексельным уставом" узору, тады вырашаць такія справы трэба па расійскаму закону [19]. Падобная сітуацыя склалася таксама вакол пытання аб тэрміне падачы апеляцый на рашэнні судоў 1-й інстанцыі. Статут ВКЛ 1588 г. яго дакладна не вызначаў, а па расійскіх законах ён абмяжоўваўся 1 годам. У снежні 1781 г. Сенатам быў выдадзены ўказ, паводле якога судам беларускіх губерняў прадпісвалася карыстацца ўказам Кацярыны II ад 30 ліпеня 1762 г. аб апеляцыйных тэрмінах. Прычым дадзенае рашэнне Сенат абгрунтоўваў, спасылаючыся на арт. 54 4-га раздзела III Статута ВКЛ, паводле якога ў выпадку ўзнікнення прававых лакун суды павінны былі дзейнічаць па справядлівасці, уласным сумленні і на прыкладах "іншых хрысціянскіх законаў" [20].

Расійскія ўлады рабілі намаганні, каб у судовых установах належным чынам спаганяліся судовыя пошліны па расійскіх законах і выкарыстоўвалася гербавая папера. Аб гэтым гаварылася ва ўказах ад 18 красавіка і 30 мая 1782 [21], [22], 10 лютага 1783 г. [23].

У цэлым, расійская сістэма судовых органаў, уведзеная паводле "Учреждений...", была больш упарадкаванай і стройнай, чым ранейшая судовая сістэма часоў ВКЛ і Рэчы Паспалітай. У ёй больш выразна вызначалася падсуднасць спраў і рэгламентаваліся рознага роду судовыя працэдуры. Разам з тым "Учреждения…" замацоўвалі ў беларускіх губернях значную ступень залежнасці органаў суда ад адміністрацыйнай улады, чаго не было ў часы ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Генерал-губернатары і губернатары надзяляліся дастаткова шырокімі паўнамоцтвамі ў сферы правасуддзя. Па-першае, яны мелі значны ўплыў на фарміраванне асабовага складу судоў: падбіралі кандыдатаў на пасады, якія замяшчаліся па прызначэнні, а таксама зацвярджалі на пасадах выбарных суддзяў. Генерал-губернатары маглі ініцыяваць крымінальную судовую справу, мелі права прыпыніць выкананне судовага прыгавора. Іх зацвярджэнню падлягалі ўсе прысуды, якія прадугледжвалі пазбаўленне жыцця ці гонару [13]. На грамадзянскае судаводства адміністрацыйная ўлада мела значна меншы ўплыў. Фактычна ў дадзеным кантэксце іх функцыі абмяжоўваліся папярэднім разглядам спраў аб казённай маёмасці, налажэннем забарон на нерухомасць, старшынства ў спецыяльных губернскіх прысутнасцях пры ацэнцы і продажы з таргоў маёмасці неплацежаздольных даўжнікоў [24, с. 222]. Пры гэтым трэба мець на ўвазе, што ступень уплыву генерал-губернатараў і губернатараў на правасуддзе магла выходзіць па-за межы, вызначаныя законам. Вышэйшае губернскае начальства ў Расійскай імперыі нярэдка злоўжывала ўладай, перавышала свае і так даволі шырокія паўнамоцтвы. Ёсць падставы меркаваць, што гэта мела месца ў беларускіх губернях. Так, вядома, што ў 1792 г. магілёўскае дваранства склала скаргу з 16 пунктаў на губернатара Пятра Пасека, у тым ліку на перавышэнне ім паўнамоцтваў у сферы правасуддзя. Сярод іншага там гаварылася, што Пасек умешваўся ў вырашэнне судамі спраў, дваранскія выбары, а то і ўвогуле замяняў сабой суд [3, с. 350–351].

Пасля смерці Кацярыны II Паўлам I у 1797 г. тут было ў агульных рысах адноўлена судаўладкаванне ўзору часоў ВКЛ. У наступным на радыкальныя ўніфікатарскія дзеянні ў сферы суда і права беларускіх зямель расійскія ўлады справакавала паўстанне 1830–1831 г. У 1831 г. у Магілёўскай і Віцебскай губернях было скасавана дзеянне Статута ВКЛ и зноў укаранена расійская сістэма судаўладкавання.

Такім чынам у сферы правасуддзя Магілёўскай і Полацкай губерняў пасля далучэння дадзенай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

тэрыторыі да Расіі адбываўся працэс яе ўніфікацыі з агульнаімперскімі судовымі парадкамі. Найбольшае значэнне ў дадзеным кантэксце мела ўкараненне тут у 1778 г. расійскай сістэмы судаўладкавання паводле "Учреждений..." Кацярыны II 1775 г. Аднак грамадзянскім судаводстве новыя судовыя ўстановы працягвалі выкарыстоўваць мясцовыя прававыя нормы, у першую чаргу III Статут ВКЛ. Адпаведна, грамадзянскі судовы працэс у беларускіх губернях значна адрозніваўся ад агульнарасійскага. Тут ён быў спаборным, а ў іншых губернях – следчым (інквізіцыйным). З гэтага вынікала яшчэ адна яскравая асаблівасць мясцовага правасуддзя – наяўнасць адвакатуры. Захаванне мясцовых норм права і польскай мовы ў грамадзянскім правасуддзі дазваляла адаптаваць "Учреждения..." пад спецыфіку беларускіх губерняў і, натуральна, спрыяла іх тут укараненню. З іншага боку, гэта было ў пэўным сэнсе прыкметай прызнання і замацавання за краем асобага палітыка-прававога статусу.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Lehtonen, U. L. Die polnischen Provinzen Russlands unter Katharina II. In den Jahren 1772–1782 / U. L. Lehtonen. – Berlin : G. Reimer, 1907. – 688 s.
2. Григорьев, В. А. Реформа местного управления при Екатерине II (Учреждение о губерниях 7 ноября 1775 г.) / В. А. Григорьев. – СПб. : Рус. скоропечатня, 1910. – 387 с.
3. Жукович, П. Н. Управление и суд в Западной России в царствование Екатерины II : [сб. отд. публ. из разн. номеров Журн. М-ва народ. просвещ.] / П.Н. Жукович. – Б. м. : б. и., 1914. – 235 (разд. паг.) с.
4. Анішчанка, Я. К. Беларусь у часы Кацярыны II (1772–1796 гады) / Я.К. Анішчанка. – Мінск : ЗАТ «Веды», 1998. – 211 с.
5. Луговцова, С. Л. Участие шляхты в комплектовании состава судебных учреждений Беларуси в конце XVIII – начале XIX в. / С.Л. Луговцова // Працы гістарычнага факультэта БДУ. Вып. 2 : навук. зб. / рэдкал.: У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУ, 2007. – С. 39–45.
6. Godek, S. O prawie i sądach w guberniach białoruskich w świetle aktów władz rosyjskich z 1772 roku / S. Godek // Zeszyty Prawnicze. – 2010. – T. 10. – № 1. – S. 173–190.
7. Ефремова, Н. Н. Становление судебной системы Белоруссии в последней трети XVIII – первой трети XIX в. / Н. Н. Ефремова // Гісторыя і сучаснасць: беларуская дзяржаўнасць ва ўсходнееўрапейскім цывілізацыйным кантэксце: зб. навук. прац, прысвеч. 90-годдзю з дня нараджэння прафесара І.А. Юхо. – Мінск : БДУ, 2012. – С. 404–408.
8. Гушчынскі, І. Г. Судовая сістэма / І .Г. Гушчынскі, А. П. Жытко, С. А. Талмачова // Грамадска-палітычнае жыццё ў Беларусі, 1772–1917 гг. / А. У. Унучак [і інш.] ; рэдкал.: В. В. Даніловіч (гал. рэд.) [і інш.] ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск : Беларус. навука, 2018. – С. 135–153.
9. ПСЗРИ. – Собр. 1. – Т. 19. – 1770–1774. – № 13808.
10. ПСЗРИ. – Собр. 1. – Т. 19. – 1770–1774. – № 13866.
11. ПСЗРИ. – Собр. 1. – Т. 19. – 1770–1774. – № 13879.
12. ПСЗРИ. – Собр. 1. – Т. 19. – 1770–1774. – № 13977.
13. ПСЗРИ. – Собр. 1. – Т. 20. – 1775–1780. – № 14392.
14. ПСЗРИ. – Собр. 1. – Т. 20. – 1775–1780. – № 14691.
15. ПСЗРИ. – Собр. 1. – Т. 20. – 1775–1780. – № 14762.
16. ПСЗРИ. – Собр. 1. – Т. 20. – 1775–1780. – № 14774.
17. ПСЗРИ. – Собр. 1. – Т. 19. – 1770–1774. – № 13920.
18. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 3310. Воп. 2. Спр. 9.
19. ПСЗРИ. – Собр. 1. – Т. 21. – 1781–1783. – № 15359.
20. ПСЗРИ. – Собр. 1. – Т. 21. – 1781–1783. – № 15293.
21. ПСЗРИ. – Собр. 1. – Т. 21. – 1781–1783. – № 15380.
22. ПСЗРИ. – Собр. 1. – Т. 21. – 1781–1783. – № 15410.
23. ПСЗРИ. – Собр. 1. – Т. 21. – 1781–1783. – № 15665.
24. Блинов, И. А. Губернаторы. Историко-юридический очерк / И.А. Блинов. – СПб. : Типо-Литография К. Л. Пентковского, 1905. – 367 с.


**Дата подачи статьи: 28.09.2018**

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ